Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 34 (686) ● 24 лістапада 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

## РАПАРТУЕМ ВЯЛІКІМІ СПРАВАМІ

У сераду адбылася агульнауніверсітэцкая камсамольская канферэнцыя. Са справаздачным дакладам выступіў сакратар камітэта камсамола Міхаіл Ціва.

Канферэнцыя праходзіла пад уражаннем ад вялікага свята — 50-годдзя Кастрычніка. Таму не выпадкова ў самой справаздачы шмат увагі было ўдзелена поспехам універсітэцкай камсамоліі ў вучобе, навуковых даследаваннях, арганізацыі адпачынку. Не могуць не радаваць вось такія лічбы і факты:

**Слаўны юбілей краіны 720 юнакоў і дзяўчат сустрэлі толькі выдатнымі поспехамі ў вучобе, 2100 займаюцца на выдатна і добра.**

**У 65 студэнцкіх навукова-даследчых гуртках цяпер налічваецца 2600 членаў. Гурткі прадставілі на рэспубліканскі агляд 180 навуковых прац, з якіх 50 аднесена да першай катэгорыі, 91—да другой і 35—да трэцяй. На апошні тур Усесаюзнага агляду студэнцкіх навуковых работ па праблемах грамадскіх навук, міжнароднага маладзёжнага руху і гісторыі ВЛКСМ рэкамендавана 20 дакладаў універсітэцкіх маладых даследчыкаў. Адзначана таксама, што ў юбілейным годзе адбыліся дзве студэнцкія навуковыя канферэнцыі, дзве канферэнцыі аспірантаў, а студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя выканала шэраг важных заказаў АН БССР, падшэфных прадпрыемстваў. Камсамольцы дапамаглі рэктарату і партыйнай арганізацыі палепшыць дзейнасць і пашырыць межы школ юных фізікаў, матэматыкаў, біёлагаў і хімікаў.**

**У гэтым годзе амаль удвая павялічан набор на факультэт грамадскіх прафесій, створаны два палітклубы, клуб рэвалюцыйна-баявой і працоўнай славы, сабраны архіўныя матэрыялы для адкрыцця Пакоя Славы, рыхтуецца зборнік «50 год універсітэцкай камсамоліі».**

**Важным сродкам выхавання моладзі сталі сістэматычныя сустрэчы камсамольцаў з ветэранамі рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, са знатнымі людзьмі краіны, экскурсіі ў музеі і па гісторыка-рэвалюцыйных месцах, літаратурныя дыспуты, кінафестывалі.**

**Значна палепшылася, стала больш цікавай і змястоўнай абаронна-масавая работа. Сотні камсамольцаў актыўна ўдзельнічаюць у мерапрыемствах дзевяці абаронных секцый і 29 гурткоў, авалодваюць спецыяльнасцямі, якія могуць спатрэбіцца, калі вораг паспрабуе напасці на нашу Радзіму. Вынослівасць і ўменне праявілі ўдзельнікі спаборніцтваў па начному арыентаванню і пераадоленню паласы перашкод, спаборніцтваў па тапаграфічнаму арыентаванню, шлюпачнага паходу па Беразіне, Прыпяці.**

**Універсітэцкія самадзейныя калектывы за справаздачны перыяд далі насельніцтву звыш 200 канцэртаў. Яны пабывалі на многіх прадпрыемствах Мінска, у дзесятках калгасаў і саўгасаў сталічнай вобласці, у Ленінградзе, Тарту, Вільнюсе, Рызе. У юбілейным годзе пачаў сваю работу студэнцкі тэатр-студыя, які падрыхтаваў ужо два спектаклі. Універсітэцкія артысты паспяхова выступілі ва ўсіх турах Усесаюзнага агляду самадзейных калектываў, прысвечаным 50-годдзю Кастрычніка. Народны аркестр народных інструментаў і Народная харавая капэла, а таксама асобныя выканаўцы сталі лаўрэатамі фестывалю і ўзнагароджаны дыпломамі і медалямі.**

**У працоўным семестры, аб'яўленым у гонар юбілею ударным, удзельнічала звыш 4 тысяч камсамольцаў. Іх сіламі пабудаван пасёлак «Юбілейны» на цаліне, 18 аб'ектаў у Беларусі. А ўсяго нашымі ўмельцамі засвоена 1304000 рублёў. Акрамя гэтага, было праведзена 12 нядзельнікаў па добраўпарадкаванню роднай сталіцы. Вялікая работа праведзена ў 56 падшэфных арганізацыях, 17 школах рэспублікі, у піянерскіх лагерах.**

Не можа не парадаваць рост універсітэцкай камсамоліі. Толькі ў юбілейным годзе яна павялічылася на 1000 чалавек. Камсамол рэкамендаваў у партыю 12 сваіх лепшых актывістаў, 26 юнакоў і дзяўчат—на кіруючую камсамольскую работу...

Лічбы, лічбы. Яны сведчаць аб тым, што пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі факультэцкія камсамольскія калектывы ўсё паўней выкарыстоўваюць магчымасці, якія дае ім Радзіма для выхавання моладзі. Аднак, як адзначалася і дакладчыкам, і выступіўшымі ў спрэчках, універсітэцкая камсамолія яшчэ ў вялікім даўгу перад партыяй і народам. Не ліквідаваны факты, калі асобныя камсамольцы дрэнна вучацца, недастойна паводзяць сябе ў грамадстве. Яшчэ не ўсе камсмольцы сістэматычна выконваюць даручэнні.

На канферэнцыі было ўзнята шмат прынцыповых пытанняў, накіраваных на далейшае павышэнне ролі камсамольскіх арганізацый, груп, курсаў, факультэтаў. Аб некаторых з іх мы раскажам у наступным нумары газеты.

Канферэнцыя, якая прайшла пад знакам падвядзення вынікаў работы ў юбілейным годзе, пад знакам крытыкі і самкрытыкі, безумоўна, дапаможа ліквідаваць выяўленыя недахопы, дабіцца яшчэ больш значных поспехаў.

У новы склад пленума выбраны лепшыя студэнты-актывісты.

## БРАТЭРСКАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Напярэдадні 50-годдзя Вялікага Кастрычніка дэлегацыя нашага універсітэта ў складзе прарэктара па навуковай рабоце прафесара Л. В. Валадзько і загадчыка кафедры гісторыі КПСС прафесара У. М. Сікорскага выязджала ў Германскую Дэмакратычную Рэспубліку для падпісання дагавору аб дружбе і супрацоўніцтве з універсітэтам імя Ф. Шылера ў горадзе Іене.

Мы папрасілі прафесара Л. В. Валадзько расказаць аб выніках візіта.

— Адпаведна гэтаму дагавору, універсітэты будуць супрацоўнічаць у галіне методыкі выкладання і навуковых даследаванняў, рэгулярна абменьвацца вопытам у арганізацыі кіраўніцтва універсітэтамі і вопытам выхаваўчай работы. Адзін з параграфаў дагавору прадугледжвае кансультацыі па актуальных праблемах навукі, тэхнікі, чытанне дакладаў і лекцый, правядзенне калоквіумаў і ўдзел у кангрэсах, навуковых канферэнцыях і ўрачыстых сходах. Спецыяльным пунктам агавораны сумесныя навуковыя мерапрыемствы па цікавых пытаннях, а таксама доўгатэрміновыя навуковыя камандыроўкі, у першую чаргу, для маладых навуковых кадраў.

Савецкія і нямецкія вучоныя атрымліваюць магчымасць павышаць кваліфікацыю па сваёй спецыяльнасці ў сяброўскім універсітэце.

Заключэнне дагавору, як падкрэслівае Леанід Вікенцьевіч, адкрывае шырокія магчымасці для ўстанаўлення сяброўскіх кантактаў. Універсітэты будуць практыкаваць узаемныя камандыроўкі груп студэнтаў для навучання і праходжання практыкі, абменьвацца навуковай інфармацыяй і публікацыямі, якія могуць прынесці карысць зацікаўленым бакам. Абмеркавана часовае карыстанне навуковымі працамі, мадэлямі, тэхнічнай апаратурай.

— Акрамя дагавора, — расказвае Л. В. Валадзько, — быў падпісан пратакол аб супрацоўніцтве на 1968 год. Ён канкрэтызуе план сумеснай работы. У прыватнасці, дасягнута дагаворанасць аб устанаўленні міжбібліятэчнага абанементу. Вялікія кніжныя багацці Іенскага універсітэта, якія налічваюць 1,5 мільёна тамоў, стануць даступнымі для студэнтаў і навуковых супрацоўнікаў нашага універсітэта. Такое цеснае супрацоўніцтва ставіць задачу больш дасканала валодаць мовай. У Іене мы ўпэўніліся, што руская мова атрымала даволі шырокае распаўсюджанне, і многія нямецкія вучоныя свабодна размаўляюць па-руску. Добрае веданне нямецкай мовы нашымі спецыялістамі і студэнтамі дазволіць больш плённа пашыраць нашы навуковыя і культурныя сувязі.

Л. В. Валадзько расказаў аб сяброўскіх абставінах, у якіх праходзіў візіт беларускай дэлегацыі. Ёй былі створаны ўсе ўмовы для знаёмства з Іенскім універсітэтам і яго інстытутамі.

Беларускія госці пабывалі ў адміністрацыйных і партыйных арганізацыях Іены, наведалі вядомыя культурныя і прамысловыя гарады ГДР Веймар, Дрэздэн, Лейпцыг.

У інстытуце эксперыментальнай фізікі Іенскага універсітэта прафесар Л. В. Валадзько выступіў з лекцыяй аб развіцці фізікі ў Беларусі.



**На здымку:** прафесар Л. В. Валадзько (злева) і рэктар універсітэта імя Ф. Шылера доктар Г. Дрэфаль падпісваюць дагавор.

## УКАЗ

### ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ТАВ. ЛАРЧАНКІ М. Р. ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

За актыўную навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць загадчыка кафедры Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна, члена Саюза пісьменнікаў Беларускай ССР, прафесара ЛАРЧАНКУ Міхася Рыгоравіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
В. КАЗЛОЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Д. ЛУКАШЭВІЧ.

18 лістапада 1967 года.
гор. Мінск.

## ПЕРШЫЯ ПАЗЫЎНЫЯ СЕСІІ

НАБЛІЖАЕЦЦА напружаная экзаменацыйная пара. Яе прыкметы адчуваюцца ў запоўненых вучэбных кабінетах і чытальных залах, па настроі саміх студэнтаў.

На першых курсах адбыліся зборы, спецыяльна прысвечаныя экзаменацыйнай сесіі. Выкладчыкі параілі тым, хто ўпершыню будзе даваць справаздачу, як лепш рыхтавацца да экзаменаў, на што звярнуць асаблівую ўвагу.

У кабінетах састаўлены спісы рэкамендаванай літаратуры, падабраны падручнікі і іншыя дапаможнікі.

А студэнты-вячэрнікі другога курса фізічнага і матэматычнага факультэтаў зрабілі ўжо першы крок. Некалькі груп здалі залікі па гісторыі КПСС. Грунтоўныя веды паказваюць тыя, хто сістэматычна рыхтаваўся да семінарскіх заняткаў, актыўна выступаў. Залікі на гэтых курсах працягваюцца.

В. КАЗЛОЎСКІ.

* * *

ЧАЦВЁРТАМУ курсу факультэта журналістыкі можна пазайздросціць. Гэта—першы выпуск факультэта. Журналісты-дыпломнікі ўжо выйшлі, як кажуць, на фінішную прамую. Пачалася экзаменацыйная сесія.

Кожная справа мае сваю асаблівасць. За чатыры гады вучобы нам давялося прайсці не адну і не дзве сесіі. Выпрацавалася пэўная сістэма і метадалогія здачы экзаменаў, якую студэнты часамі называюць «увогуле пранесла». Але «пранесці» можа толькі тады, калі ў цябе добрыя, трывалыя веды. У гэтым яшчэ раз упэўніліся Анатоль Гарбачоў, Алег Слука, Фёдар Кулакоў і іншыя. Першыя залікі яны здалі на выдатна. Гэты «почырк» рабяты вытрымліваюць з першага курса.

У другіх жа поспехі больш сціплыя. І тым не менш ёсць упэўненасць, што журналісты-дыпломнікі з гонарам вытрымаюць апошні экзамен на прафесійную сталасць.

А. ЯРОХІН,
студэнт - дыпломнік факультэта журналістыкі.

# БЫЦЬ ПАМОЧНІКАМ ПАРТЫІ — НАШ АБАВЯЗАК

**У сувязі з 20-годдзем газеты «Беларускі універсітэт» рэдакцыя атрымала шмат віншаванняў і водгукаў. Сябры-журналісты, чытачы, вітаючы шматтыражку з юбілеем, жадаюць ёй і надалей быць баявым памочнікам партыі, актыўна змагацца за ажыццяўленне яе рашэнняў па камуністычнаму будаўніцтву.**

**Рэдкалегія сардэчна дзякуе ўсіх прыслаўшых віншаванні, пажаданні і крытычныя заўвагі.**

## РЭДАКЦЫІ, АЎТАРСКАМУ КАЛЕКТЫВУ, ЧЫТАЧАМ

Дарагія сябры!

Прыміце ў дзень 20-годдзя Вашай газеты самыя цёплыя, самыя сяброўскія віншаванні ад калектыва «Советской Белоруссии».

Большасць нашых творчых работнікаў—выпускнікі факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Вучоба там была для нас, як правіла, цесна звязана з удзелам у газеце «Беларускі універсітэт», на старонках якой мы рабілі першыя крокі ў журналістыку, авалодвалі прафесіяй, майстэрствам. Мы і цяпер лічым «Беларускі універсітэт» сваёй газетай, захоўваем да яе глыбокую павагу і шчыра зацікаўлены ў яе далейшых поспехах.

Мы, супрацоўнікі «Советской Белоруссии», упэўнены, што Ваша газета і надалей будзе баявым памочнікам партыі, праваднікам яе ідэй у калектыве вучоных, выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта.

Дваццацігоддзе газеты «Беларускі універсітэт» супадае са знамянальным святам—паўвяковым юбілеем Вялікага Кастрычніка. Таму вельмі хочацца падкрэсліць, што няма для Вашай гезеты больш ганаровай задачы, чым усімі сродкамі садзейнічаць падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, гарачых патрыётаў Радзімы, здольных прадоўжыць вялікі подзвіг старэйшых пакаленняў савецкіх людзей, гатовых ператварыць у жыццё велічныя ідэі Уладзіміра Ільіча Леніна, імя якога носіць універсітэт.

*Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия».*

## РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»

Дарагія сябры!

Горача віншуем вас з вялікім святам—паўвекавым юбілеем Кастрычніка і 20-годдзем з дня выхаду першага нумара газеты «Беларускі універсітэт»!

Шчыра жадаем заўжды ярка асвятляць жыццё і вучобу студэнтаў, актыўна дапамагаць партыйнай арганізацыі, рэктарату выхоўваць у моладзі вернасць камуністычным ідэалам, прагу да авалодання вяршынямі навукі, рыхтаваць актыўных будаўнікоў цудоўнай будучыні—камунізма.

**Рэдакцыя газеты «Звязда».**

## СЛОВА ДА НОВАГА ПАПАЎНЕННЯ ГІСТФАКА

У апошнія гады мы, выкладчыкі, здзіўляемся недастатковым ведам па гісторыі ў абітурыентаў, якія паступаюць на гістарычны факультэт.

Гэты недахоп ведаў у галіне гісторыі можна растлумачыць, перш за ўсё, недастатковай патрабавальнасцю да вучняў у сярэдняй школе, адсутнасцю экзаменаў па гісторыі пры пераходзе з класа ў клас.

Ва універсітэце студэнтам даводзіцца вывучаць гісторыю спачатку ў межах сярэдняй школы і універсітэцкі курс. Таму падрыхтоўка да экзамена ці заліка патрабуе сістэматычнай паўсядзённай працы на працягу ўсяго семестра.

І самая недаравальная памылка нашых студэнтаў-гісторыкаў — думка, што можна паспяхова падрыхтавацца да экзамена ці заліка на працягу 5—6 дзён, якія даюцца на падрыхтоўку ў час экзаменацыйнай сесіі.

Нават акадэмік за такі кароткі тэрмін не зможа вывучыць і запамятаць факты і лічбы, механізм і сувязі падзей, якія змешчаны ў падручніку у 800 старонак. Універсітэцкія ж падручнікі па аб'ёму такія.

Навучальны працэс — гэта разнабаковая праца: выкладчык чытае курс і дае ключ да разумення і засваення падручніка, тлумачыць найбольш цяжкія раздзелы курса, выкладае новыя пункты гледжання; студэнт вывучае, гэта значыць, запамінае, утрымлівае у сваёй памяці матэрыялы падручніка і лекцый. Калі студэнт неахайна адносіцца да сваёй задачы, і тры прафесары не змогуць дапамагчы яму.

Н. П. ПАЛЕТЫКА, прафесар. («Гісторык»).

## ЯРКІЯ СТАРОНКІ НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ

**Насценная газета на факультэце — гэта не толькі гісторыя, гэта палітычнае асэнсаванне факультэцкіх падзей, якія выкладзены ў скупых, але дакладных газетных матэрыялах, насычаных элементамі публіцыстыкі.**

**Публіцыстычнасць, ідэйнае багацце, вастрыня ў вырашэнні кожнага пытання, граматная мова робяць газету цікавай і адпавядаючай сучаснаму жыццю, павышаюць яе аўтарытэт. І як правіла, у такіх газетах пастаянна адчуваецца прыліў таленавітай студэнцкай моладзі, аспірантаў, выкладчыкаў. Без пашыранай карэспандэнцкай сеткі не можа быць гутаркі аб поспехах газеты ў ажыццяўленні надзённых задач.**

Калі разглядаць у цэлым, то ўсе дзевяць насценных газет факультэтаў заслугоўваюць добрых водгукаў. Кожная з іх мае сваю адметную рысу, сваю спецыфічную тэматыку, свае найбольш пашыраныя жанры і знешняе афармленне.

Усе апошнія нумары былі прысвечаны святкаванню 50-годдзя Савецкай улады.

Перадавой «Вялікі Кастрычнік у БССР» пачынаецца юбілейны нумар сценгазеты «За навуку» фізічнага факультэта. Артыкул ад агульных, але важных меркаванняў падыходзіць да канкрэтных пытанняў. У ім гутарка ідзе не толькі аб рэспубліцы, але і аб універсітэце і, вядома, аб фізічным факультэце. Гэтая тэма працягваецца і ў іншых матэрыялах, дзе гаворыцца аб выкананні факультэтам сацыялістычных абавязацельстваў у гонар юбілею. На гэтым фоне даецца і характарыстыка будняў факультэта.

Заслугоўвае ўвагі і перадавая «Гісторыка» — «Гісторык—юбілею», у якой таксама вядзецца размова аб дасягненнях факультэта ў галіне вучобы, навуковай працы і выхаваўчай работы.

Усе газеты без выключэння пранізаны велічным шэсцем 50-гадовага Кастрычніка. Старонкі газет прадастаўлены і для выступленняў вучоных, былых выпускнікоў універсітэта, вядомых грамадскіх і палітычны дзеячоў. У газеце «Решим любую задачу» (матфак), напрыклад, з успамінамі выступіла В. В. Паўлава—член КПСС з 1920 года.

У артыкуле «Я веру ў маладосць» пад рубрыкай «Старэйшыя людзі факультэта» расказана аб лёсе былога дэкана біялагічнага факультэта Ольгі Дзмітрыеўны Акімавай. Нажаль, гэты цікавы матэрыял пададзен у газеце скупа. Варта было б яго пашырыць.

Ёсць вельмі трапны загаловак у газеце геафака — «Юбіляры юбілейнага». Ён аб'ядноўвае матэрыялы аб жыцці і дзейнасці вучоных: прафесара А. Р. Мядзьведзева і кандыдата геаграфічных навук дацэнта А. С. Акінчыца. Гэта добры прыклад—ушанаванне юбіляраў у насценным друку.

Многа ёсць у насценгазетах артыкулаў, якія носяць гістарычны характар. Так, у «Хіміку» большасць матэрыялаў расказвае аб утварэнні кафедр неарганічнай хіміі, фізічнай і калоіднай хіміі, хіміі высокамалекулярных злучэнняў, аб рабоце гэтых кафедр у цяперашні час.

На высокім узроўні аформлена газета біялагічнага факультэта «Віта». Яна напісана жывой і яркай мовай.

Трэба адзначыць, што не ўсе газеты звяртаюць увагу на эстэтыку афармлення. У «Савецкім юрысце» і «Хіміку» няма ні аднаго фотаздымка. Гэтым газетам у прыклад можна паставіць мастацкае афармленне «Журналіста», «Слова філолага», «Гісторыка».

Пытанні вучобы, практыкі і працоўнай дзейнасці студэнтаў займаюць важнае месца ў многіх насценных газетах. Але, як ні дзіўна, працоўнаму семестру і вытворчай практыцы многія з іх адводзяць значна больш месца, чым непасрэдна вучобе: лекцыям, семінарам, працы ў бібліятэцы, у інтэрнаце.

Заслугоўвае увагі роздум аб прафесіі ў «Савецкім юрысце». У гэтай вялікай размове прымае ўдзел генерал-маёр юстыцыі БССР, ваенны пракурор БВА І. П. Пастарэвіч.

«Хімік» даволі часта змяшчае на сваіх старонках сатырыка-юмарыстычныя матэрыялы. Але, нажаль, гэтыя матэрыялы накіраваны не на канкрэтных асоб, а на студэнта ўвогуле.

«Журналіст» — самая маладая факультэцкая газета. Але ўжо з першых дзён яна заявіла аб сабе з лепшага боку. На яе старонках многа цікавых і жывых матэрыялаў. Як заўсёды, авеена лірыкай «Слова філолага».

Агульны недахоп насценнага друку універсітэта — вельмі мала расказаў і нарысаў аб цікавых людзях, якія сустракаюцца паўсядзённа, на кожным кроку, з якімі вучымся і працуем. Не хапае матэрыялаў і аб жыцці студэнтаў вячэрняга і завочнага навучання.

*Ю. АГАРАДНІЧЭНКА.*

## НАФТАХІМІІ— ЗЯЛЁНУЮ ВУЛІЦУ

Дасягненні сучаснай навукі і тэхнікі прывялі да узнікнення новай галіны прамысловасці — перапрацоўкі нафты і атрымання многіх новых карысных рэчываў.

У 60-ыя гады прыйшоў час у Беларусі на базе нафтаправода стварыць сваю нафтаперапрацоўчую і нафтахімічную прамысловасць. Адкрыццё сваіх месцанараджэнняў нафты яшчэ больш аблячае вырашэнне задачы.

У сувязі з гэтым, падрыхтоўка кадраў для новай галіны прамысловасці ў БССР стала неадкладнай справай. Хімічныя факультэты універсітэтаў павінны выпускаць хімікаў для навукова-даследчай работы і для лабараторый заводаў.

Мэтазгодна стварыць у апошнія гады навучання студэнтаў некаторае іх прафіліраванне, даць ім належную тэхналагічную асвядомленасць у галіне іх будучай дзейнасці. Для частковага выканання гэтай задачы на нашым факультэце створана кафедра нафтахіміі. Пачынаючы з чацвёртага курса студэнты праходзяць шэраг спецыяльных дысцыплін і лабараторных практыкумаў (хімія нафты, тэарэтычная аснова нафтахімічнага сінтэзу, тэхналогія нафтахімічнага сінтэзу), мэтанакіраваную практыку на адпаведных прадпрыемствах БССР і выконваюць дыпломную работу у галіне нафтахіміі. Такая сістэма дае высокую тэарэтычную і практычную падрыхтоўку хіміка, які знаёмы з агульным тэхналагічным афармленнем нафтахімічных прадпрыемстваў.

У бягучым годзе адбудзецца першы выпуск (16 чалавек) па новай спецыяльнасці. На чацвёртым курсе па нафтахіміі спецыялізуюцца 22 студэнты.

Галоўным напрамкам навуковай работы кафедры з'яўляецца ўскрыццё сувязей паміж будовай і тэрмадынамічнымі уласцівасцямі некаторых класаў злучэнняў—прадуктаў нафтахімічнага сінтэзу. Такога роду звесткі неабходны для разлікаў прамысловых выхадаў і завадскога абсталявання новых вытворчасцей.

У гэтым годзе кафедра здала у друк тры навуковыя работы гэтага напрамку.

Недахоп у мінулым належнай навуковай зацікаўленасці да нафтахіміі не толькі на факультэце, але і ў асяроддзі навуковых супрацоўнікаў Беларусі, прывёў да недахопу мясцовых педагагічных і навуковых кадраў, спецыяльнай літаратуры навуковага і даведніцкага характару ў гэтай галіне.

Цяпер кафедра рыхтуе студэнтаў-нафтахімікаў, якія ў далейшым змогуць з поспехам працаваць на розных хімічных прадпрыемствах і ва ўстановах рэспублікі.

**Д. І. АНДРЫЕЎСКІ, прафесар. («Хімік»).**

## ТРЭЦЯЯ Ў ЮБІЛЕЙНЫМ



Ужо з таго дня, калі ў «Вячэрнім Мінску» была апублікавана аб'ява аб абароне кандыдацкай дысертацыі, Мікалай Іванавіч Базылеў у прадчуванні адказнага моманту ў сваім жыцці і ў навуковай дзейнасці прыкметна хваляваўся. Заўважаючы гэтае хваляванне, старэйшыя сябры жартам пыталіся ў яго: «Ну, як, Коля, прыпякае?». Маўляў, ведаем: самі перажылі. Ну, а малодшыя, якія толькі паступілі ў аспірантуру, гледзячы на хваляванне Мікалая Іванавіча, думалі: «І нас, пэўна, чакае такое хваляванне, Нялёгкі ўсё ж шлях навукі!».

Так, Мікалай Іванавіч хваляваўся. Хваляваўся не толькі ён, але і ўсе яго калегі па кафедры палітэканоміі, хоць ніхто не сумняваўся ў поспеху, у грунтоўнай і поўнай абароне.

Шмат працы і старання ўклаў дысертант у сваё даследаванне. Вяліся напружаныя і бясконцыя разлікі, каб выявіць эканамічную эфектыўнасць павышэння культурна-тэхнічнага ўзроўню калгасных механізатараў. Спецыяльна дзеля гэтых разлікаў Мікалай Іванавіч самастойна вывучаў карэлятыўны метад, перачытаў дзесяткі і сотні навуковых работ і артыкулаў, пераварушыў горы пярвічных і бухгалтарскіх дакументаў у калгасах. Менавіта таму з выключнай упэўненасцю і перакананнем ён дакладваў Вучонаму Савету вынікі сваіх даследаванняў, а таксама прапановы, якія ён вылучыў у сваёй рабоце.

Актуальнасць праблемы, узнятай дысертантам, была прызнана афіцыйнымі і неафіцыйнымі апанентамі, доктарам эканамічных навук членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР Ф. С. Марцінкевічам, кандыдатам эканамічных навук І. Н. Церліжэнка, начальнікам Капыльскага сельскагаспадарчага ўпраўлення Г. Р. Жукавец. І як вынік—адзінадушнае галасаванне за прысуджэнне навуковай ступені кандыдата эканамічных навук.

На кафедры палітычнай эканоміі гэта трэцяя абарона кандыдацкай дысертацыі ў юбілейным годзе Савецкай улады, якая адкрыла дарогу ў навуку людзям працы. Цікава зазначыць, што бацька Мікалая Іванавіча зусім непісьменны селянін. Пры царызме ён не мог атрымаць ніякай асветы. А яго сын становіцца вучоным. Ці можа быць больш яскравы прыклад таго, якія змены ў жыцці працоўных мас прынеслі Вялікі Кастрычнік, перамога Савецкай улады!

У. КУЛАЖАНКА.



**Перш чым стаць высокакваліфікаваным работнікам газеты, будучым журналістам яшчэ ў сценах універсітэта даводзіцца набываць неабходныя навыкі крытычнага разбору розных па жанру матэрыялаў, выпрацоўваць асабісты журналісцкі почырк.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнты-журналісты вячэрняга аддзялення разам з выкладчыкам Вадзімам Іванавічам Дубовікам аналізуюць матэрыялы па жанру рэпартажа.**

Фота **І. Аскіркі.**

## НОВАЯ КАФЕДРА

*На факультэце журналістыкі створана новая кафедра — тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання. Акрамя нашых універсітэцкіх выкладчыкаў, тут будуць працаваць вядомыя беларускія радыё- і тэлежурналісты. Узначальвае кафедру М. Е. Дастанка.*

*Ідзе падрыхтоўка да адкрыцця кабінета тэорыі і практыкі радыё і тэлебачаня, які будзе абсталяваны навейшай апаратурай і дзе будуць створаны належныя ўмовы для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў па новых галінах журналісцкай дзейнасці.*

### Прапаноўвае клуб «Амікецо»

# БЕЛАРУСКУЮ ЛІТАРАТУРУ — ЗАРУБЕЖНАМУ ЧЫТАЧУ

Усё часцей творы беларускіх пісьменнікаў перакладаюцца на замежныя мовы, усё больш інтэнсіўным становіцца абмен духоўнымі каштоўнасцямі паміж народамі. І сапраўды, творы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Танка і многіх іншых нашых пісьменнікаў перакладзены не толькі на мовы народаў СССР, але і на замежныя мовы. У той самы час у нашай рэспубліцы выдадзены ў перакладзе на беларускую мову творы Шэкспіра, Беранжэ, Міцкевіча, Караславава і многіх іншых замежных пісьменнікаў. Аднак мы не можам быць задаволены тым, што дасягнута ў гэтай галіне. У нас вельмі мала перакладаў замежных пісьменнікаў на беларускую мову. А колькі твораў беларускай літаратуры, якія варты таго, каб іх перакладалі на замежныя мовы, застаюцца невядомымі замежнаму чытачу! У сувязі з гэтым савет студэнцкага эсперанта-клуба «Амікецо» пры Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце замежных моў вырашыў усю работу клуба ў 1968 годзе правесці пад дэвізам: «Беларускую літаратуру — замежнаму чытачу!»

У наступным годзе будуць перакладзены і надрукаваны ў шматлікіх перыядычных выданнях на міжнароднай мове эсперанта творы беларускіх пісьменікаў як старэйшага, так і малодшага пакаленняў. У той жа час некаторыя творы эсперанцкай арыгінальнай літаратуры будуць перакладзены на беларускую мову і надрукаваны ў беларускім друку.

Аднак і ў наступныя гады мы вырашылі весці інтэнсіўную работу ў гэтым напрамку. Пры нашым клубе будуць арганізаваны двухгадовыя завочныя курсы па вывучэнню міжнароднай мовы эсперанта для студэнтаў факультэта журналістыкі і аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Гэтыя курсы маюць сваёй мэтай рыхтаваць перакладчыкаў з мовы эсперанта на беларускую і з беларускай мовы — на эсперанта. Таварышаў, якія могуць сумнявацца ў магчымасці падрыхтоўкі літаратурных перакладчыкаў толькі за два гады, ды яшчэ на завочных курсах, мы можам пераканаць, адзначыўшы, што эсперанта — самая лёгкая мова ў свеце, для яе вывучэння трэба затраціць у 10—15 разоў менш часу, чым для вывучэння, напрыклад, англійскай мовы. А што датычыцца перакладчыцкага майстэрства, тут мы разлічваем на дапамогу секцыі мастацкага перакладу Саюза пісьменнікаў Беларусі. Так што, справа за вамі, таварышы студэнты факультэта журналістыкі і аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта.

Завочны курс першага года навучання прадугледжвае выкананне 15 кантрольных работ і трох мастацкіх перакладаў з мовы эсперанта на беларускую. Пасля залiковага субяседавання, студэнты, якія паспяхова засвоілі праграмны мінімум, атрымаюць значкі эсперантыстаў. Другі год навучання прадугледжвае выкананне 10 кантрольных работ, 5 мастацкіх перакладаў з эсперанта на беларускую мову і трох мастацкіх перакладаў з беларускай мовы на эсперанта.

Студэнты іншых факультэтаў прымаюцца на шасцімесячныя курсы па вывучэнню мовы эсперанта.

Заявы на імя старшыні клуба падаюцца ў аудыторыі № 520 будынка «А» Інстытута замежных моў з 27 лістапада на працягу ўсяго тыдня з 19.30 да 21 гадзіны.

Першая кансультацыя адбудзецца ў нядзелю, 3 снежня, а 12 гадзіне ў той жа самай аўдыторыі.

А. ПАЎЛЮКАВЕЦ,
старшыня студэнцкага эсперанта-клуба «Амікецо» пры Мінскім дзяржпедінстытуце замежных моў.

ІДЗЕ ДЫСПУТ

# ЛЮДЗІ АСАБЛІВАГА СКЛАДУ

Цэлы месяц не зыходзіць з экранаў мастацкі фільм С Герасімава «Журналіст». І ўвесь гэты час залы кінатэатраў запоўнены да адказу. «Журналіст» карыстаецца поспехам у гледачоў. Не выпадкова, што першымі ва універсітэце на гэты фільм адгукнуліся студэнты факультэта журналістыкі. На дыспуце, прысвечаным «Журналісту», было многа гарачых спрэчак. Усе, ад першакурснікаў да выпускнікоў, дэталёва разбіралі фільм, супастаўляючы яго з канкрэтнымі фактамі жыцця. Прывядзем некалькі характэрных выступленняў.

*У. Вялічка:* Цікавы фільм. Але чаму ён названы «Журналістам»? На працягу двух серый фільма галоўны герой напісаў усяго адну інфармацыю. Я не ўбачыў у ім журналіста, якім я яго ўяўляю.

*Б. Герстэн:* Не тыпічна, што такі малады хлопец пападае ў саюзную газету. Але, калі б і быў паказаны сапраўдны журналіст і сапраўдная яго журналісцкая дзейнасць, матэматыку ці слесару, напрыклад, было б нецікава глядзець яго. Іх больш зацікавіў бы фільм праблемны, аб характары чалавека ўвогуле. А гэта ёсць у фільме.

*А. Ліпскі:* Як журналіст, Аляб'еў мне не падабаецца. У камандыроўцы вядзе сябе распушчана. Не разабраўшы да канца справы з пісьмамі, якія паступілі ў рэдакцыю, выязджае ў Маскву. Не спраўляючыся са сваімі абавязкамі ў аддзеле пісем, ён усё ж ідзе на «павышэнне» — у міжнародны аддзел. Не растлумачана ў фільме і многае іншае.

*Ф. Кулакоў:* у фільме «Іду на навальніцу» мы бачылі фізікаў, якія «кіпяць» у сваёй справе. Гэты фільм цікава глядзець людзям розных прафесій. У «Журналісце» гэтага няма. Калі б усе журналісты працавалі так, як Юрый Аляб'еў, газеты або не выходзілі б тэрмінова, або ў кожнай з іх былі б белыя плямы.

*М. Красноўскі:* Я не імкнуўся ўбачыць тут сапраўднага журналіста. Я хацеў убачыць маладога чалавека з яго няўдачамі, памылкамі, але які ўсё ж пазбавіўся іх. Такога чалавека я ўбачыў у асобе Аляб'ева.

*М. Скварцоў:* Добра зрабіў аўтар фільма, што сутыкнуў два персанажы — савецкага і амерыканскага журналістаў. У цэлым фільм даў нам вобраз журналіста, няхай не праз Аляб'ева, але затое праз усіх журналістаў, якія паказаны ў фільме. І гэтым фільм цікавы.

Выкладчык *Людміла Фёдараўна Шылава* ў многім не згадзілася з некаторымі выступаючымі. Яна ўгледзела ў гэтым фільме цікавыя пошукі і назіранні, аўтарскі роздум над жыццём у шырокім яго праяўленні.

З цікавасцю чакалі ўдзельнікі дыспута выступлення ініцыятара гэтай размовы — дацэнта кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі *Ефрасінні Леанідаўны Бондаравай.*

— Трэба паважаць задуму аўтара і з гэтага пункту гледжання зыходзіць. Герасімаў паставіў перад сабой смелую задачу — павесці размову аб назначэнні, месцы чалавека ў грамадстве, не навязваючы гледачу пастаўленую праблему. Самае цікавае ў фільме — шматпланавыя разважанні аўтара, які не робіць спробы схіліць усіх нас на свой бок, а стараецца ўпэўніць.

Фільм, вядома, не ва ўсім дасканалы. Ён завельмі расцягнуты, маюць месца нецікавыя і нават непатрэбныя эпізоды. Галоўны герой вялы, маларухомы. Не завострана дыскусія аб мастацтве, якую вядзе сам рэжысёр з французскай актрысай. Можна зрабіць і іншыя папрокі ў адрас стваральнікаў фільма. Але нельга не быць ім удзячнымі за тую рэакцыю, якую выклікаў у гледачоў «Журналіст».

Да гэтага часу некаторыя ясна не ўяўляюць, што гэта за прафесія — журналіст?

Фільм адыграў сваю ролю. Ён зацікавіў многіх, прымусіў звярнуць асаблівую ўвагу да людзей з прафесіяй журналіста. Аб гэтым гаварыў дэкан факультэта *Рыгор Васільевіч Булацкі.*

Але ці задаволіў фільм гэты інтарэс? — Спрэчкі працягваюцца.

### ПЕРШЫ ЖУРНАЛІСЦКІ КРОК

## МАЯ СЛУЧЧЫНА

**Чалавеку, які прыязджае ў Слуцк, наш горад адразу можа здавацца непрыгожым і сумным, без асаблівых прыкмет. Але горад мой значна прыгажэйшы і цікавейшы, чым здаецца спачатку. Вясною ён патанае ў зелені і бела-ружовым тумане квітнеючых садоў. І нават не гэта галоўнае. Мне хочацца расказаць аб тым, якімі былі горад і раён раней і якімі сталі цяпер Вызначальная рыса дарэвалюцыйнай Случчыны — убогасць. Для пацвярджэння гэтага дастаткова прывесці хоць бы такі факт: на кожныя сем чалавек выпускалася ў год дзве пары скуранога абутку.**

**У адной з такіх бедных вёсак — Лапацічы — жыў калісьці Ігнат Уласавец — цемны, непісьменны селянін. Змог ён, хоць і цяжка было, пракарміць сямёра дзяцей. Не прышлося Ігнату пабачыць лепшае жыццё: памёр у гады першай сусветнай вайны. Але засталіся дзеці — яго вочы, рукі, яго сэрца. Яны і ўбачылі святло рэвалюцыйных пераўтварэнняў і сваімі рукамі кавалі шчасце для ўсёй краіны. А калі сэрца Радзімы забілася трывожна ў суровыя гады вайны, сыны Ігната Уласаўца — Аляксандр, Рыгор і Аляксей пайшлі на фронт. Аляксандр загінуў на полі бою, так і не даведаўшыся, што Радзіма ацаніла яго мужнасць званнем Героя Савецкага Саюза. Сёстры героя Ганна і Надзея, не ведаючы адпачынку, працавалі ў тыле, забяспечваючы краіну хлебам.**

**Выстаяў народ. Выраслі ўнукі Ігната. Трое—інжынеры, двое — афіцэры Савецкай Арміі, адзін — настаўнік, унучка — медыцынскі работнік, фармацэўт. Дачка Аляксандра Уласаўца — інжынер, сын — афіцэр. Яшчэ пяць унукаў Ігната працуюць у калгасе. Усе яны жывуць добра.**

**Мы сутыкнуліся з гісторыяй толькі адной беларускай сям'і. Але наколькі тыпічны яе лёс! Унукі тых, хто марыў аб шчаслівай долі, уславілі свой край баявымі і працоўнымі подзвігамі, стварылі цудоўныя мастацкія каштоўнасці.**

**Слуцкія ткачыхі і вышывальшчыцы ў красавіку месяцы 1936 года аб'ядналіся ў арцель. Размясцілася яна ў маленькім будынку. Значная частка рабочых жыла і працавала ў прыгарадах і на хутарах. Тады арцель выпускала беларускія ручнікі і блузкі. Адна з брыгад ткала хусткі, пакрывалы, шаўковыя паясы.**

**Прадукцыя цяперашняй арцелі «1 Мая» радуе сваёй высокай якасцю, а праца майстроў атрымала шырокае прызнанне. Лепшай ткачысе ручной вытворчасці Ніне Мікалаеўне Паўлавай прысвоена званне народнага ўмельца. Яна ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», а майстар змены Марыя Сяргееўна Крукава — медалем «За працоўную доблесць».**

**Мне давялося сустрэцца з Нінай Мікалаеўнай Паўлавай. Гэта вельмі цікавая жанчына. Яна поўнасцю захоплена сваёй працай, нястомна шукае новыя ўзоры паясоў, ахвотна расказвае аб мастацтве сваіх сяброваk. З незвычайным гонарам яна паказала эскізы будучых работ. І я зайздросціла ўмелым рукам гэтага цудоўнага майстра.**

**Народныя ўмельцы распрацоўваюць усё новыя і новыя сувеніры. Толькі на сусветную выстаўку ў Манрэаль яны адправілі 4000 гальштукаў, 1000 жаночых паясоў, 600 жаночых сумачак, 250 мужчынскіх паясоў з нацыянальным беларускім арнаментам.**

**Незвычайных людзей можна сустрэць усюды. У калгасе «Прамень камуны» працуе Вольга Мікалаеўна Сакалоўская. У гады вайны ў партызанскім лесе яна нарадзіла сына. Снегам прала пялёнкі, сушыла іх цяплом свайго цела і тым жа цяплом саграваладзіця, цудам зберагла яго. Цяпер Мікалай — афіцэр Савецкай Арміі. Выгадавала Вольга Мікалаеўна і дачку Ганну. Яна заканчвае медвучылішча і прыедзе ў родны калгас фельдшарам.**

**У нас на Случчыне многія вучацца. Толькі ў сельскагаспадарчых інстытутах завочна вучацца 233 калгаснікі, 219 — у тэхнікумах. Больш 200 юнакоў і дзяўчат са Случчыны вы сустрэнеце ў інстытутах і тэхнікумах на стацыянары. Прага да ведаў вялізная!**

**...Наступае вечар. Я іду па знаёмых вуліцах майго горада. Як памаладзеў 850-гадовы Слуцк! Новыя жылыя дамы, магазіны, цырульня, школа... Яны адцяснілі маленькія хаткі старога Слуцка. Новае на кожным кроку, у кожным дні нашага жыцця.**

**М. КАРЫТНАЯ,**
**студэнтка журфака.**

# Літаратурная старонка

Штомесячны выпуск

## НА РАДЗІМЕ

*Валерый ЗАКОННІКАЎ*

Я зноў сцяжынкай роснай
крочу
Па месцах, дзе не быў
даўно.
Ірвуцца белыя сарочкі
На хрусткіх плечах
качаноў.

Туман сплывае па разорах
Ракой на прыазёрны дол.
Як грушы выспелыя, зоры
Збірае раніца ў прыпол.

За мною цягнецца расяны,
Зялёны, сакавіты след.
Як зухаваты хлопец, ранак
Чырвоны надзяе берэт.

Плывуць лілеі паплаўкамі
На хвалях ранішняй ракі.
Прыкрыўшы тварыкі
лісткамі,
Глядзяць з палян баравікі.

Тут неба вышай, даль
блакітней,
Трава мурожная мякчэй,
І поле выспелага жыта
За сонца летняе ярчэй.

Крамяны бор, прастор
азёрны
Мяне здаўна вучылі жыць.
Край глыбачанскі, край мой
зорны,
Ты стартам у жыццё
ляжыш.

## НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

Цясляр ударыць па вуглу сякерай
І слухае: спяваюць сцены.
А потым скажа, пот з ілба змахнуўшы:
«Жывіце шчасна, дом збудован добра.
На ўсё жыццё!»
Славуты майстар — бондар наш вясковы,
Зрабіўшы кадку, горда кажа людзям:
«Я выбраў адмысловы дуб на дошкі,
І кадка выйшла, ладная на дзіва.
На ўсё жыццё!»

Я ведаў і раней, што з сосен стромкіх,
Цымбалы робяць звонкія, як неба.
Тугія струны пад рукой умелай
Свой спеў вясёлы дораць людзям
На ўсё жыццё.
І я іду у лес, шукаю рыфмы
І слухаю, аб чым спяваюць сосны.
А потым гэты спеў кладу у вершы
І людзям аддаю з душою шчырай
На ўсё жыццё.

*Алесь РАЗАНАЎ*

## ЭКСПЕРЫМЕНТ

**З глыбінь,**
**як мова з кратэра,**
**Вырвецца распад.**
**Экс-перы-мен-та-та-ры —**
**Што зламаны сад.**
**Вякі сышліся ў зале**
**Аддаць ім свой паклон—**
**Святло, што вызвалялі,**
**Іх сэрцы апякло.**
**Як панначка у церам,**
**Як Езус у касцёл,**
**Выслізгвае у цемру**
**З далоні адкрыццё.**
**Учора за гарамі,**
**Цяпер выразна, тут...**
**Лаві, кардыяграма,**
**Узмахі амплітуд.**
**А маладому сняцца**
**Усмешкі і руччы.**
**Адчайна мітусяцца**
**Спакойныя ўрачы.**
**Загінем—не загінем,**
**Бадай, не ў гэтым суць,—**
**Работу, што пакінем,**
**Другія данясуць.**
**Танцуе на бярозе**
**Напружаны прамень.**
**Як сцяг,**
**у бессмяроцце**
**Нясём эксперымент.**

*Віктар ЯРАЦ*

* * *

Я не быў
на вайне мінулай.
Я не быў
на вайне ні дня.
Я не чуў,
як свісталі кулі
І ад бомбаў
стагнала Зямля.
...Нарадзіўся я ў сорак
восьмым...
Сад абпалены
трызніў вайной.
І рабіны
гарэлі увосень
То крамянай зарой,
то крывёй...
Я хаджу
пад блакітам звонкім.
Ды напружаны
кожны мой нерв:
Бо рабінаў
чырвоныя гронкі
Набракаюць
крывёй
і цяпер...



*Мікола КАМАРОЎСКІ*

## У МІКАЛАЕЎШЧЫНЕ

**Да 85-годдзя з дня нараджэння Якуба КОЛАСА**

Знікла сцежка ў прырэчных
дубах,
Пабягу і яе адшукаю.
Заблуджуся — цікавасць і
страх,
І спакусай — трава маладая.
Тут, аддаўшыся марам,
адзін
Вельмі часта задумлівы
Костусь
Пазіраў, як з туманных
лагчын
Ранак сонца на хвоі
ускочваў.
І святло тое ззяла ў душы
І займалася над Беларуссю.
Дуб лістамі ледзь-ледзь
варушыў
І да сонца, магутны,
цягнуўся...
Сцежка далей і далей
вядзе.
Страшна: дзесці яна
абарвецца.
Бачу: дзядзька Якуб вунь
ідзе,
Між кустоў яго постаць
здаецца.
Я хацеў бы паклікаць,
гукнуць,
Можа рэха яго адшукае.
І балюча: назад не вярнуць
Хваль, што з быстраю
рэчкай сплываюць.
Тут усё — яго думак працяг:
Ціхі Нёман, зямля і лістота.
Тут нашэптваюць казкі
жыцця
Вербалоза кусты і чароту.
А падвечар, як песня
дзяўчат
Родным словам за сэрца
кранае,
Ціха стогнуць дубы
і маўчаць,
Што між іх земляка
не хапае.

## ПАЛАНЕЗ АГІНСКАГА

Пачуццяў я ў душы не
утаймаваў.
І змрок вячэрні слаўся
нізка-нізка,
Як над зямлёй, над
цішынёю траў,
Бы гімн душы,
Бы гімн жыцця,
гучаў
Бясконца задумёны
Паланез Агінскага.
Жыццё спыніла свой
імклівы бег,
Прыціхла ў баяна гуках
дзіўных.
Ўздыхаў мелодыяй
караючаю мех,
Дзе боль і сум, дзе
непатрэбен смех,
Дзе развітанне горкае з
з радзімай.
Адданасць сэрца і любоў
душы
Блукалі па зацішшы родных
сцежак,
І спазмы боль, бясконцы
боль душыў,
Аж струны сэрца лопалі
ў цішы,
І іскры крэслі агнёў жывых,
мяцежных.
Не супыніць мелодыі
парыў—
Пажар душы у полымі
агністым...
І дзе б ні быў, і колькі б
ні пражыў,
Мне не забыць таксама
родных ніў,
Яны са мной,
Як Паланез Агінскага.

*Мікола ДЗЕМІДОВІЧ*

## ТАМУ МЫ Ў ДАРОЗЕ

Сэрца спыняецца раз у
жыцці.
Таму мы ў юнацкай трывозе
Спяшаемся ўперад,
каб болей прайсці,
Таму мы заўсёды ў дарозе.

●

## БЯРОЗЫ

Я сек. І падалі бярозы.
Туман сляды злачынства
крыў.
Выплакваў моўчкі ранак
росы.
Сціхаў балючы рэха крык...



З вачэй не дым мне
цісну слёзы.
Я зразумеў каля агню:
Вялікадушныя бярозы
Мне аддавалі цеплыню.

*Алесь ЯКІМОВІЧ*



## МАЎЧУН

*Рыпяць палазы. Іскрыцца, гарыць на сонцы снег. Трыццаць градусаў, не менш. Мароз шчыпле. Шустры конік шпарка бяжыць па ўезджанай дарозе. «Бач ты,—думаю я, —напэўна і яму не надта цёпла. Бяжыць, стараецца. А можа гэта таму, што яго чакае цёплая канюшня і духмянае сена...»*

*У перадку сядзіць мой дзядзька. З-пад лахматай зімовай шапкі відаць сурова насупленыя густыя бровы, асыпаныя інеем. Дзядзька маўчыць. Ані слова. Толькі рэдкае: «Но, сівы, но!» І зноў ціха. Не навядзеш яго на размову. Маўчун.*

*Мяне чамусьці пачынае разбіраць на яго злосць. Маўчыць, як вады ў рот набраўшы, хоць ты крыкам крычы. Размаўляў бы, дык і весялей было б. І дарога хутчэй прайшла б разам з траскучым марозам!*

*Я таксама панурыўся. Маўчу. Засадзіў рукі ў кішэні паліто. Холадна. Дзядзька адварочваецца, глядзіць на мяне і моўчкі скідае свае рукавіцы. Ні слова не гаворачы, кідае мне іх на калені. З удзячнасцю гляджу на яго, і мне становіцца вельмі цёпла, радасна...*

## ЛЮДЗІ, ЯК ПТУШКІ

**Наступае восень. Па пустынных вуліцах вецер ганяе пажоўклае лісце. З кожным днём больш і больш марозіць. Птушкі, сабраўшыся ў чароды на парыжэлым лузе, апошні раз аглядаюць знаёмыя мясціны. Яны развітваюцца з наваколлем, якое дапамагло ім выкарміць сваіх дзяцей. Хутка, вельмі хутка паляцяць яны ў цёплыя краіны.**

**Пройдзе некаторы час, павее з радзімы цёплы ветрык, і яны зноў будуць спяшацца сюды. Многа цяжкасцей сустрэнецца на іх шляху. Слабейшыя не вытрымаюць, загінуць, але астатнія будуць ляцець і ляцець у свой бацькоўскі куточак.**

**Так і чалавек. Дзе б ён ні знаходзіўся, радзіма заўсёды будзе вабіць яго да сябе. Чалавек заўсёды вернецца да бацькоўскага дома.**

*Юрка ГОЛУБ*

## АЎТАСТРАДА

Выціскаць.нібы анучу,
З мокрым лобам
спідаметр.
Шар зямны,
як шарф раскручваць,
І у прыдарожніку
самлець!

О, запаветнае імкненне:
Імчацца ў вербы і кляны!
І як жанчына, на
імгненне,
Аддацца слабасці,
калі
Уроссып кіне небяспека
Дрэвы,
думкі
і шляхі!
І рассыплюцца, як
спектры,
Вачэй праменні са шчакі!
А за спіной гудзе развага
Планеты,
бору,
адкрыцця...
І бясконца йшчэ
развязваць
Клубок дарогі і жыцця...

## МУРАШЫНЫЯ ЦАРСТВЫ

**Як людзі, закаханыя ў**
**сонца,**
**І яны насцеж вокны вясной**
**расчыняюць.**
**Як канатаходцы, ідуць па**
**сасонцы,**
**У неба глядзяць вачыма.**
**Мурашыныя царствы ў**
**барах...**
**Раўнапраўныя царствы**
**і вольныя.**
**Церушыцца сухая кара,**
**Кладзецца ў хаты пад**
**голлямі.**

*Іван СТАНКЕВІЧ*

## КЛОПАТ

**У клопаце,**
**Як выйсці ў трубку,**
**Ператварыцца ў буйны**
**колас—**
**Зернетка з сонечным**
**пералівам —**
**Пірагі на багаты стол.**
**. . . . . . .**
**Белы верш —**
**Белы хлеб, —**
**Не ведаю,**
**Як зерні высеяць,**
**У трубку выйсці,**
**Закаласіцца...**
**Куды падзецца з**
**клопатам!..**

**ДА ВЕДАМА НАРОДНЫХ КАНТРАЛЁРАЎ БДУ**

**Чарговыя занятні школы народных кантралёраў БДУ адбудуцца 30 лістапада а 16 гадзіне ў аўд. 205.**

**Рэдактар М. ІОСЬКА.**

Зак. 1812. АТ 23211 **Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. № 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».**